6 клас

1. Упішыце словы ў табліцу.

зубраня, бацька, хваля, мясцовасць, медаль, збожжа, семя, Нарач, жыццё, край, рунь, цень, пыл, палын, сабака, святло.

| Мужчынскі род | Ніякі род | Жаночы род |
|---|---|---|
| | | |

2. Утварыце прыметнікі пры дапамозе суфікса – ск – .

Баранавічы, Любань, інстытут, мастак, таварыш, кіргіз, грамада, студзень, сакавік, Нясвіж.

1 сл. – 0,25б. 2,5б.

3. Складзіце тры сказы, параўноўваючы ў іх:

а) сілу льва і ваўка

б) шырыню ракі і раўчука

в) цвёрдасць граба і ліпы

3б.

4. Адзначце, якія словазлучэнні са структурным кампанентам лічэбнікам з'яўляюцца фразеалагізмамі

1. дзесятая спіца ў коле;
2. другое дыханне;
3. чацвёртая сасна;
4. сто чалавек;
5. на адзін зуб;
6. сем пятніц на тыдні;
7. дзесяць рублёў;
8. другі конь;
9. трыццаць дзён;
10. трыццаць сярэбранікаў.

4б.

5. Дапішыце прыказкі:

Чужы кусок дзярэ _____.

Сказанага слова да ____ не вернеш.

_____ да Кіева давядзе.

3б.

6. Складзіце па два словазлучэнні з прыведзенымі словамі так, каб кожнае з іх ужывалася ў родным склоне адзіночнага ліку з канчаткам – а (- я ) і з канчаткам – у (- ю ). Запішыце гэтыя словазлучэнні.

Клён –

Дагавор –

Народ –

Раз'езд –

Курс –

7. Выберыце з прапанаваных словазлучэнняў нарматыўныя

(Асобы, асобасны) аддзел; (асаблівыя, асабовыя) намаганні; (асабістая, асаблівая) бібліятэка.

3б.

усяго 24,5